Анатоль КОЗІЧ

**Стажок на валакушы**

Відовішчам, на момант той вялічным,
Ураджаны амаль на ўсё жыццё.
Як па дарозе трактар гусенічны
Вязе стажок па снежным пакрыцці.

А той, як пан, сядзіць на валакушы,
Нібы гігіча: «Гэй, давай хутчэй!»
І аж ляціць, а не паволі рушыць
Па следзе пазаўчарашніх завей.

Дзіцячы позірк праз акно зачараваны,
Чакае, калі ж будзе ехаць зноў.
А ў памяці ўжо замалявана
Для ўспамінаў і далёкіх сноў.

Даўно ўжо стажкі вось так не возяць,
Прыбралася і вуліца ў асфальт.
А трактар той на памятнай дарозе
Усё едзе дзесьці ў памяці назад.